# Ня так кепска, як яно выглядае

Нешматлюдным быў VI зьезд БАСу, які адбыўся 19 лютага ў Беластоку — усяго 14 дэлегатаў зь Беластоку і Варшавы. Усё–такі засталося ад яго добрае ўражаньне.

Як сьцьвердзіў у сваёй справаздачы прэзыдэнт БАСу Юрка Сульжык, летась адбыліся ўсе традыцыйныя арганізаваныя БАСам галоўныя мерапрыемствы: сьвяткаваньне 25 Сакавіка (у Варшаве, а ў Беластоку — супольна зь Беларускім саюзам), Купальле, рэйд "Бацькаўшчына", "Басовішча", вогнішча падчас моладзевага паломніцтва на Сьвятую Гару Грабарку, атрасіны (у Беластоку і ў Варшаве). Выдаваўся студэнцкі часопіс "Сустрэчы". Апрача гэтага, упершыню арганізаваная была "Бардаўская ноч" у Варшаве.

Юрка Сульжык закрануў таксама прынцыповыя справы. Паводле яго, існуе думка, быццам бы БАС распадаецца ды невядома, колькі ў яго сябраў. На думку прэзыдэнта, стан БАСу адлюстроўвае проста агульную атмасфэру ў студэнцкім асяродзьдзі. Цяпер іншы час, чым калісь. Вучыцца цяпер цяжэй, і ў сувязі з гэтым не хапае ахвотных да грамадзкай працы. Тым ня менш, на арганізаваныя БАСам мерапрыемствы сыходзіцца надалей вельмі многа людзей. "Думаю, што ўсё ня так кепска, як яно выглядае", — скончыў прэзыдэнт.

Сапраўды, жменька сабраных дэлегатаў ніякім чынам не нагадвала прадстаўнікоў разваленай арганізацыі. Нарады ішлі ў вясёлым настроі, да чаго, безумоўна, спрычыніліся жарты Валіка Стральчука ды прысутнасьць аднагадовай Гандзі Пякарскай. Была нават прапанова, каб адразу яе выбраць у Галоўную раду, як першакурсьніцу. Выказваньне самой Гандзі наконт прапановы не ўдалося, на жаль, атрымаць.

Зьезд вырашыў арганізаваць сёлета усе традыцыйныя мерапрыемствы і выбраў новае кіраўніцтва БАСу. Прэзыдэнтам аднагалосна быў пераабраны Юрка Сульжык, студэнт V курсу гісторыі Варшаўскага ўнівэрсытэту. У Галоўную раду ўвайшлі: Ганна Адамік і Гражына Адамік, студэнткі IV курсу эканомікі Філіялу Варшаўскага ўнівэрсытэту ў Беластоку, Ян Карпюк, студэнт V курсу тэхналёгіі дрэваапрацоўкі Галоўнай школы сельскай гаспадаркі ў Варшаве, Аліна Каўбасюк, студэнтка III курсу эканомікі Філіялу ВУ ў Беластоку, Яраслаў Паўлючук, выпускнік юрыдычнага факультэту Філіялу ВУ ў Беластоку, цяпер аплікант у пракуратуры, Ганна Сапяжынская, студэнтка I курсу тэалёгіі Хрысьціянскай тэалягічнай акадэміі ў Варшаве і Дарота Сульжык, студэнтка IV курсу польскай філялёгіі Філіялу ВУ ў Беластоку. У Галоўную раду ўваходзіць таксама Яраслаў Лукашук, старшыня варшаўскага гуртка, студэнт III курсу лясьніцтва Галоўнай школы сельскай гаспадаркі ў Варшаве.

Новаму кіраўніцтву БАСу выпаў незайздросны час дзейнасьці. Безумоўна, сёньняшняе студэнцкае асяродзьдзе пазбаўленае пачуцьця грамадзкай місіі, якім былі авалоданыя пачынальнікі БАСу. З гэтай прычыны неабходна знайсьці такія формы дзеяньня, якія адпавядаюць новай рэчаіснасьці. Думаю, гэтыя формы будуць знойдзеныя.

БАС зьяўляецца ўжо гістарычнай арганізацыяй, пра што сьведчыць кніжка, прысьвечаная студэнцкаму руху, напісаная Яўгенам Вапам і Славамірам Іванюком (кніжка рыхтуецца ўжо да друку)*. "Гістарычная" — ня значыць "якая адышла ў гісторыю". Можна спадзявацца, што будзе каму запісваць наступныя разьдзелы басаўскай гісторыі.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1994. 7 сакавіка. № 10. С. 4.

---

* Маецца на ўвазе выданьне: *Iwaniuk S., Wappa E. Białoruski ruch studencki w Polsce 1981—1992. Białystok, 1995. 330 s.* — **Рэд.**